

# Сімфонія кахання

**У аддзеле мастацтва Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Ф. Карскага адкрылася шостая выстава з цыкла «Дакранушца да гісторыі»: «Сімфонія кахання. Вясельная фатаграфія на Гродзеншчыне канца XIX – сярэдзіны XX стагоддзя». Яна будзе дзейнічаць да сярэдзіны чэрвеня.**

У экспазіцыі прадстаўлена каля 300 рарытэтных фотаздымкаў з калекцыі гродзенскага калекцыянера і краязнаўцы Аляксандра Сявенкі, а таксама з сямейных фотаальбомаў супрацоўнікаў і чытачоў бібліятэкі. Акрамя таго, на выставе можна ўбачыць рэдкія літаграфіі 1870-х гадоў, старадаўнія паштоўкі, друкаваныя выданні, пярсцёнкі і іншыя прадметы, якія распавядаюць аб гісторыі традыцыйнага вяселля ў Прынямонні. Дадаткова прадстаўлены фотаздымкі залатых і срэбных вяселляў 1920-х – 1930-х гадоў.

Як расказаў Аляксандр Сявенка, тэрмін «фотаздымак» упершыню з'явіўся ў 1839 годзе. У 1860 г. у гродзенскай фотастудыі, дзе працавалі Ілля Штурман і Доўнар-Запольскі, былі зроблены першыя фотаздымкі. У канцы XIX – пачатку XX стагоддзя з'явіўся жанр вясельнага фотаздымку. Па словах Аляксандра Віктаравіча, позняе з'яўленне дадзенага жанру характарызуецца тым, што апрацоўка фотаздымкаў займала шмат часу. Па гэтай прычыне маладыя прыходзілі сфатаграфавацца пасля вяселля. Менавіта гэта было для іх адным з прыемных забаў мядовага месяца.

Спачатку фотаздымкі былі студыйнымі. У 20-я гады фатографы ўжо выходзілі на вуліцу і фатаграфавалі на месцы правядзення вяселля. У далейшым пачынаюць фатаграфаваць разнастайныя эпізоды вясельных абрадаў – сватанне, вянчанне, застолле, каравайны абрад і інш.

Галоўны бібліятэкар аддзела мастацтва Людміла Вдавенка заўважыла, што сярод фотаздымкаў прадстаўлены работы такіх знакамітых гродзенскіх фотамайстроў першай паловы XX стагоддзя, як Карасік і Гельгор, Рубінштэйн і Анерык, фотастудыі «Venus», якая была вельмі папулярнай, і інш. На выставе прысутнічаюць фотаздымкі з фотамайстэрняў гарадоў і мястэчак былой Гродзенскай губерніі – Ваўкавыск і Беласток, Дзятлава і Новы Двор, Ражанка, Брэст-Літоўск, Шарашова і г.д. Ёсць асобныя фотаздымкі фотамайстэрняў іншых рэгіёнаў Расійскай імперыі, якія звязаны з міграцыяй жыхароў Гродзеншчыны, а таксама з Канады і ЗША, якія даслалі эмігранты з Прынямоння сваім бацькам, або прывезеныя з-за мяжы пасля вяртання на Радзіму.

«Упрыгожваннем выставы з'ўляецца вясельны куфар з пасагам нявесты. У ім знаходзяцца старадаўнія дамотканыя ручнікі, абрусы, посцілкі-капы, вышыўка і інш. Куфар зроблены ў 1899 годзе мясцовым майстрам з вёскі Прывалка Гродзенскага раёна і ўпрыгожаны традыцыйным роспісам», – адзначыла Людміла Леанідаўна.

На выставе можна ўбачыць пасведчанні аб шлюбе, царскія, польскія і савецкія пашпарты гродзенцаў, у якіх запоўнена традыцыйная графа аб сямейным становішчы, паштоўкі з віншаваннем з нагоды прыняцця шлюбу. Цікавымі з'ўляюцца і перадшлюбныя дамовы беларускіх сялян 1920-х – 1930-х гг., запрашэнні на вяселлі 1930-х гадоў, а таксама старадаўнія пярсцёнкі, якія зроблены з медных і бронзавых манет.

Веранiка ЯХНО.
Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.